гляд дзяцей і інш. Яскрава бачны быў і падзел працы на мужчынскую і жаночую, імітацыя ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, мужа і жонкі.

З надыходам вясны пачыналіся гульні дзяцей на свежым паветры (качанне па траве, у жмуркі, у мароза, катанне з гор, у класы і інш.).

У дзіцячых гульнях адлюстроўвалася грамадскае жыццё вёскі: гулялі «ў старасту», «у папа», «у жабракоў».

У падлеткаў разам з гульнямі, што патрабавалі шмат фізічнай сілы, былі і такія забавы, дзе неабходна было праявіць кемлівасць («Жгуцікі», «Гарадкі», «Куць», «Капустка», «Бабкі»). Сабраўшыся гуртам, дзеці любілі гуляць у фанты, жмуркі, сапсаваны тэлефон і інш. Дзяўчынкі летам скакалі праз вяровачку. Даволі папулярнай у хлопчыкаў была бараньба («Боркі»).

У старшых падлеткаў важнае месца займалі танцы. Танцавалі «Лявоніху», «Мікіту», польку, мазурку, казака, кракавяк і інш.

Такім чынам, відавочна, што гульні мелі важнае значэнне ў жыцці дзяцей, садзейнічалі іх выхаванню. Як рэальная частка народнай культуры, яны цесна звязаны з гісторыяй народа, яго бытам, працоўнай дзейнасцю, звычаямі і традыцыямі. Таму сёння асабліва актуальным і важным уяўляецца выкарыстанне народных гульняў у працэсе выхаваўчай работы ў школе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Р.Ф.Шаура,** *прафесар*

## АРГАНІЗАЦЫЙНА-СТРУКТУРНЫЯ АСПЕКТЫ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ДЛЯ СФЕРЫ НАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Галіна мастацкай культуры, звязаная з выяўленчай дзейнасцю, уключае адукацыйныя ўстановы сярэдняга, сярэднеспецыяльнага і вышэйшага звёнаў. Да катэгорыі навучальных устаноў, якія могуць і павінны рыхтаваць кадры спецыялістаў для сферы на-

роднай творчасці ў сістэме адукацыі. адносяцца прафесійныя вучылішчы мастацкага профілю, вучылішчы мастацтваў, спецыялізаваныя мастацкія вучылішчы або тэхнікумы і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Прафесійна-тэхнічныя адукацыйныя структуры (Бабруйскае вышэйшае мастацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча, Мірскае ПТВ рэстаўратараў, Кобрынскае ПТВ дэкаратыўнага роспісу, мінскае ПТВ будаўнікоў №25 і інш.) рыхтуюць кваліфікаваных спецыялістаў-выканаўцаў для вытворчасці на фабрыках мастацкіх вырабаў, у мастацка-рэстаўрацыйных майстэрнях, на керамічных і фарфоравых заводах, а таксама для работы ў дзіцячых выхаваўчых установах, Дамах народных рамёстваў, студыях і гуртках выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Наступная адукацыйная ступень – сярэднія спецыяльныя мастацкія ўстановы (вучылішчы мастацтваў, Мінскае і Гомельскае мастацкія вучылішчы), якія рыхтуюць кадры для работы ў сферы культуры, мастацтва, у арганізацыйна-метадычных установах народнай творчасці ці для работы ў агульнаадукацыйных школах, дашкольных выхаваўчых установах.

Спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй рыхтуюць Беларуская акадэмія мастацтва, а таксама спецыялізаваныя факультэты Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, Віцебскага універсітэта імя П.М.Машэрава, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка. У педагагічных універсітэтах выпускнікі мастацкіх факультэтаў атрымоўваюць кваліфікацыю педагога-мастака. Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры рыхтуе спецыялістаў з кваліфікацыяй мастака народных рамёстваў, выкладчыка спецыяльных дысцыплін, якія арыентаваны на мастацка-творчую, метадычна-арганізацыйную і педагагічную дзейнасць у галіне культуры і адукацыі.

У апошні час пашыраецца сетка такіх навучальных устаноў, як мастацкія ліцэі, гімназіі, каледжы. Менавіта яны павінны арганізоўваць і весці навучальны працэс на ўзроўні патрабаванняў еўрапейскіх адукацыйных стандартаў сярэдняга звяна. Ліцэі і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гімназіі, калі яны ажыццяўляюць навучанне пад патранажам адпаведнай ВНУ, забяспечваюць магчымасць мэтанакіраванага пераходу сваіх выпускнікоў на наступную, вышэйшую ступень акадэмічнага або універсітэцкага адукацыйнага ўзроўню.

Задачы вывучэння, захавання і памнажэння нацыянальнага культурнага здабытку робяць актуальнымі пытанні мастацкай адукацыі. Сучасныя патрабаванні да адукацыі прадугледжваюць наяўнасць бесперапынных адукацыйных структур на аснове паэтапнага, мэтанакіраванага развіцця асобы ад дашкольнага ўзросту да прафесійнай дзейнасці чалавека. Рашэнне названай задачы, у сваю чаргу, немагчыма без эфектыўнага выкарыстоўвання назапашанага тэатрэтычнага і практычнага вопыту пераемнасці зместавых і працэсуальных бакоў навучання і адлюстравання гэтага вопыту ў выглядзе адукацыйнай канцэпцыі. Мастацкая адукацыя павінна базіравацца на бесперапыннасці і пераемнасці працэсу навучання і выхавання, паколькі агульнакультурныя і мастацкія веды і навыкі не могуць паўнацэнна сфарміравацца толькі ў перыяд навучання ў вышэйшай школе. Яны складваюцца паступова на ўсіх этапах навучання ў залежнасці ад узроставых і індывідуальных асаблівасцей творча адоранай асобы.

Сёння перад Рэспублікай Беларусь стаяць задачы асэнсавання важнасці нацыянальных традыцый, захавання самабытнасці і своеасаблівасці нацыянальнай культуры, стварэння канцэпцыі самастойнай мастацкай школы. Усё гэта абумоўлівае пэўны спектр кірункаў развіцця беларускай культуры і сістэмы адукацыі.

У практычнай плоскасці стварэнне ступеньчатай, пераемна ўзаемазвязанай сеткі дзяржаўных і недзяржаўных адукацыйных устаноў, паказчыкі функцыянавання якой вызначаюцца дакументамі ліцэнзавання, атэстацыі і акрэдытацыі, вызначае выпрацоўку адзінай адукацыйнай канцэпцыі. Найбольш актуальнай у сусветнай педагагічнай прасторы з'яўляецца ідэя бесперапыннай адукацыі. Змены структурнай арганізацыі навучальных устаноў сістэмы адукацыі, для якіх характэрны працэс наладжвання вертыкальных і гарызантальных сувязей, вылучаюць у якасці асноўных



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

крытэрыяў аптымізацыі структурных перамен феномен запатрабаванасці грамадства ў абнаўленні і універсалізацыі сучасных ведаў, а таксама прынцып пераемнасці розных ступеняў і ўзроўняў адукацыі.

Сістэма адукацыі сёння мае дастаткова развітую форму забеспячэння, аднак не з'яўляецца беспераыннай для канкрэтнага чалавека. Чым больш адукаваны чалавек, тым цясней ён узаемазвязаны з прыродай, грамадствам, іншымі людзьмі і тым вышэй патэнцыяльныя магчымасці ўзнікнення ў яго новых прафесійных і непрафесійных адукацыйных запатрабаванняў. Гэта значыць, у самой адукацыі асобы закладзена неабходнасць беспераыннасці яе развіцця. У сваю чаргу рэалізацыя сістэмы беспераыннай адукацыі залежыць ад ступені гатоўнасці грамадства задаволіць індывідуальныя прафесійныя і непрафесійныя адукацыйныя патрэбы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ